3) использовать соотнесение с грамматикой туркменского языка в случае, когда нужно разграничить падежные формы с одинаковыми окончаниями в русском языке (например, *мам**ы** – ejet**iň** – eje**ler***).

**Литература**

1 Долбик, Е. Е. Русский язык : таблицы, схемы, упражнения / Е. Е. Долбик, В. Л. Леонович, В. А. Саникович. – 15-е изд., испр. – Минск : Вышэйшая школа, 2022. – 320 с.

2 Байджанов, Б. Туркменский язык (учебное пособие по практическому курсу) / Б. Байджанов. – Ашхабад : Изд-во Туркменского национального института мировых языков имени Долетмаммеда Азади, 2008. – 158 с.

**УДК 373.5.091.3:821.161.3-32*Я.Баршчэўскі**

***К. В. Бусева***

## АДМЕТНАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ ТВОРЧАСЦІ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА Ў 6 КЛАСЕ

*У артыкуле акрэсліваюцца асноўныя метадычныя падыходы да вывучэння апавядання “Вужыная карона” Яна Баршчэўскага. Твор прадугледжаны праграмай па беларускай літаратуры для шостага класа. Адзначаюцца магчымыя шляхі работы з міфалагічным і літаратурным матэрыялам. Аўтар прыходзіць да высновы аб неабходнасці папулярызацыі творчасці Яна Баршчэўскага.*

Ян Баршчэўскі – адна з ключавых фігур беларускай літаратуры XIX стагоддзя, чыя творчасць стала важным фактарам у развіцці нацыянальнай самабытнасці і мастацтва слова. Творы пісьменніка не толькі адлюстроўваюць народную культуру, побыт і светапогляд беларусаў таго часу, але і садзейнічаюць фармаванню літаратурнай мовы і ўмацаванню нацыянальнай самасвядомасці. Асаблівае месца ў яго спадчыне займае зборнік “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”, у якім арганічна спалучаюцца элементы фальклору, рамантычнай паэтыкі і сацыяльнай крытыкі. У сваім артыкуле мы паспрабуем раскрыць асноўныя метадычныя падыходы да аналізу творчасці Яна Баршчэўскага вучнямі 6-х класаў.

Дзеці ўпершыню знаёмяцца з творчасцю гэтага пісьменніка на прыкладзе апавядання “Вужыная карона”, змешчанага ў раздзеле “Пра міфічных істот (духаў)”. Сама назва раздзела схіляе вучняў да ўспрымання твора як незвычайнага, напоўненага містыцызмам і фальклорнай фантастыкай, глыбока звязанага з культурай нашых продкаў.

Школьная праграма па літаратуры на знаёмства і вывучэнне твора Яна Баршчэўскага адводзіць толькі дзве гадзіны. На нашу думку, гэты час можна выкарыстаць з максімальнай эфектыўнасцю, каб не толькі замацаваць матэрыял у памяці дзяцей, але і наблізіць, падштурхнуць і натхніць іх на самастойнае далейшае вывучэнне творчасці Яна Баршчэўскага. Прыкладнае планаванне раіць размеркаваць час наступным чынам. На першым уроку – “пазнаёміць са зместам і жанравымі адметнасцямі апавядання «Вужыная карона», адзначыць яго міфалагічную аснову. Дапамагчы вучням зразумець галоўную думку твора, асэнсаваць спрадвечныя маральныя высновы жыцця” [1, с. 70]. На другім уроку – “звярнуць увагу шасцікласнікаў на падабенства і адрозненне вобразаў у міфалогіі і літаратуры; удасканальваць уменні вучняў вызначаць у празаічным творы сэнсавыя часткі, складаць план, пераказваць асноўныя эпізоды, характарызаваць героя паводле яго ўчынкаў і паводзін” [1, с. 70].

Безумоўна, у якасці ўступнага этапа на першым уроку трэба выкарыстаць біяграфічную даведку. Без разумення асобы Яна Баршчэўскага, таго, якія падзеі ў жыцці аўтара маглі натхніць яго на напісанне твораў з фальклорна-міфалагічнай асновай, дзецям складана будзе зразумець ідэйны змест апавядання. Настаўнік павінен паказаць партрэт пісьменніка, а таксама распавесці пра ключавыя і цікавыя моманты яго біяграфіі, якіх няма ў падручніку. У якасці эпіграфа там пададзены ўласны верш Яна Баршчэўскага “Край мой, дзе горы паўсталі ўзнёсла...”. Верш гэты павінен чытаць або настаўнік, або загадзя падрыхтаваны вучань, каб правільна перадаць заключаныя ў ім пачуцці. Дзецям трэба адчуць настрой верша і адказаць на праблемнае пытанне “Што для мяне значыць мой край?”. Такім чынам, яны могуць уявіць сябе на месцы аўтара і пры гэтым успомніць, за што яны любяць свой родны кут. На этапе абагульнення другой гадзіны па тэме варта зноў звярнуцца да гэтага пытання і прасачыць, як змяніліся адказы вучняў.

З даволі сцісла напісанай біяграфіі, пададзенай у падручніку-хрэстаматыі, вучні даведаюцца, што Ян Баршчэўскі жыў каля 1780–1851 гг., нарадзіўся ў сям’і дробных шляхціцаў у вёсцы Мурагі Расонскага раёна Віцебскай вобласці. Цікава, што ў падручніку аўтар падаецца як беларускі і польскі пісьменнік, хаця, на наш погляд, больш карэктна гаварыць пра Я. Баршчэўскага як пра беларускага пісьменніка, які пісаў на дзвюх мовах. Яго галоўны твор “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях” напісаны пераважна на польскай мове з беларускамоўнымі ўстаўкамі, вылучанымі курсівам. Але творчасць Яна Баршчэўскага транслюе беларускі погляд на свет, за што яго неаднойчы папракалі сучаснікі, у прыватнасці І. Галавінскі: “Мова зусім простая, не польская, а беларуская – у кожным слове нібы чуеш беларуса” [Цыт па: 2, с. 142]. Кожны беларускамоўны твор Яна Баршчэўскага (“Гарэліца”, “Дзеванька”, “Бунт хлопаў”), кожная польскамоўная балада (“Русалка-спакусніца”, “Дзве бярозы”, “Курганы”, “Роспач”, “Партрэт”, “Рыбак” і інш.) заснаваны на беларускім фальклоры.

У падручніку падаецца інфармацыя пра тое, як аўтар любіў кожнай вясной і летам падарожнічаць па Беларусі пешшу, малюючы пейзажы і размаўляючы з самымі рознымі людзьмі. У гэтых вандроўках пісьменнік і збіраў фальклор: народныя песні, легенды і паданні, якія пазней паклаў у аснову сваіх твораў. Сам аўтар адзначаў: “Сярод беларускага люду захоўваюцца яшчэ і цяпер асобныя паданні даўніх часоў, якія, пераходзячы ад чалавека да чалавека, зрабіліся такія ж цьмяныя, як і міфалогія старажытных народаў” [3, с. 44].

Апошні абзац уступнага тэксту – своеасаблівая рэклама галоўнага твора Яна Баршчэўскага, вядомага не толькі ў Беларусі, але і за мяжой – зборніка апавяданняў “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”, часткай якога з’яўляецца “Вужыная карона”. Іншыя апавяданні з гэтай кнігі вывучаюцца ў старэйшых класах, таму настаўнік павінен зацікавіць вучняў асобай і творчасцю пісьменніка.

Перад першасным чытаннем апавядання “Вужыная карона”, каб выклікаць у вучняў цікавасць да незвычайнага фальклорнага зместу, можна арганізаваць уступную гутарку. Напрыклад: “Скажыце, калі ласка, ці верыце вы ў містыку? Ці верылі вы ў містычных істот у дзяцінстве? Ці выклікалі вы розных духаў (добрых ці злых)?” Гэтыя пытанні апелююць да ранняга дзяцінства, калі фантазія маленькіх чытачоў малявала цікавыя і адначасова вусцішныя вобразы нячысцікаў і бабаек.

Каб праверыць якасць успрымання твора вучнямі, можна арганізаваць рэпрадуктыўную гутарку наступнага зместу:

– Якія эпізоды ў творы фантастычныя і нагадваюць нам міфы і казкі?
– Якім быў лоўчы Сямён, як ён ставіўся да сваіх абавязкаў?
– Як Сямён трапіў у залежнасць ад нячысціка?
– Што перажыў герой на Ласінай гары?
– Як змянілася жыццё Сямёна пасля сустрэчы з Вужыным Каралём?
– Ці зрабіла гэта яго шчаслівым?
– Што дапамагло лоўчаму вызваліцца ад чорных сіл?
– Ці мог Сямён абысціся без дапамогі нячыстай сілы?

У якасці дамашняга задання вучні павінны перачытаць твор і зрабіць творчае заданне па жаданні (напрыклад, намаляваць аднаго з персанажаў ці сцэну з твора і ў вусным выступленні патлумачыць свой выбар).

На другой гадзіне вывучэння апавядання неабходна звярнуць увагу шасцікласнікаў на падабенства і адрозненне вобразаў у міфалогіі і літаратуры. Варта абраць павобразны шлях аналізу, што дазволіць ахарактарызаваць героя паводле яго ўчынкаў і паводзін. Настаўнік павінен дапамагчы вучням зразумець галоўную думку твора, асэнсаваць спрадвечныя маральныя высновы жыцця: чалавеку для таго, каб вытрымаць неспрыяльныя жыццёвыя абставіны, патрэбна быць аптымістычным, верыць у свае сілы, не здавацца, не сумаваць, а ўпарта перамагаць усе нягоды; галоўнае – не траціць веру ў сябе і свае здольнасці. На ўроку неабходна дапамагчы вучням вызначыць эпізоды, важныя для спасціжэння імі сапраўдных матываў паводзін панскага лоўчага Сямёна, разумення мастацкай ідэі твора (пакуль без ужывання самога тэрміна).

Пачаць урок трэба з узнаўлення ведаў і праверкі выканання дамашняга задання. Для гэтага можна правесці франтальнае апытанне ці пагуляць ў гульню “Так ці не?”, напрыклад:

1 Сямён быў лоўчым. (так)

2 Аканом загадаў Сямёну накасіць травы. (не – паляваць)

3 Сямён сустрэў на паляванні чорнага воўка. (не – чорнага сабаку)

4 Лоўчы пайшоў на Вужыную гару. (не – Ласіную гару)

5 Вуж даў яму карону. (так)

6 Дзяўчынку звалі Марыся. (так)

7 Яна дала Сямёну пацалаваць крыжык. (так)

8 Карона пераўтварылася ў галлё. (не – сухія лісточкі)

Пад час павобразнага аналізу галоўнага персанажа Сямёна можна выкарыстаць прыём “Сіта”. Настаўнік дае карткі са словамі, дзеці працуюць у парах, каб “прасеяць” якасці Сямёна і выбраць тыя, якія яму падыходзяць: хцівасць, сквапнасць, хітрасць, наіўнасць, кемлівасць, знаходлівасць, працавітасць, дасціпнасць, мудрасць, настойлівасць. Калі дазваляе час, работу можна выканаць у пісьмовай форме.

Важна зрабіць акцэнт на міфалагічнай аснове твора – фальклорнай легендзе пра Вужынага Караля. Для гэтага неабходна выкарыстаць гісторыка-культурны каментар або даць апераджальнае заданне, каб загадзя падрыхтаваны вучань прачытаў ці пераказаў арыгінальную народную легенду. Прывядзем ніжэй яе тэкст: “Вужыны Кароль выглядае як вялізны чорны або залаты вуж з бліскучымі вачыма і залатой каронай на галаве. Часам яго апісваюць як змяю з некалькімі залатымі рагамі або з асляпляльна зіхатлівай галавой. Карона Вужынага Караля надзяляе яго магічнымі здольнасцямі, робячы яго не толькі ўладаром усіх змей, але і сувязным паміж светам жывых і падземным царствам. <…> Лічылася, што Вужыны Кароль валодае ведамі, недаступнымі звычайным людзям. Ён мог адказваць на пытанні пра будучыню, даваць парады тым, хто звяртаўся да яго з павагай, і нават абараняць ад злых сіл. . <…> Паводле павер’яў, карона Вужынага Караля была чароўнай. Той, хто здабываў хаця б адзін з залатых рагоў, якія ўпрыгожвалі карону, атрымліваў здольнасць разумець мову звяроў, чытаць чужыя думкі і мець поспех ва ўсіх справах. Акрамя таго, уладальнік такога рага станавіўся неўспрымальным да атруты і мог знаходзіць схаваныя скарбы. Аднак здабыць карону было няпроста: трэба было паслаць на шляху Вужынага Караля белы ручнік, пакласці на яго хлеб і соль, і, пакланіўшыся, папрасіць: «*Вуж малады, скінь рог залаты*». Калі ж спрабаваць атрымаць карону хітрасцю або сілай, гэта магло прывесці да гневу ўсіх змей і нават да смерці” [4]. Тэкст легенды даволі невялікі, што дазваляе прачытаць яго на ўроку. Незразумелыя словы павінны быць растлумачаны пад час чытання тэксту або перад чытаннем. Таксама карысна будзе данесці інфармацыю пра Узвіжанне. Можна даць аднаму з вучняў апераджальнае заданне – зрабіць паведамленне пра гэтае свята. Далей трэба параўнаць народную легенду з творам Яна Баршчэўскага і знайсці агульнае і адметнае.

У якасці дамашняга задання на другой гадзіне можна задаць сціслы пераказ апавядання па складзеным на ўроку плане-загалоўках:

1 Заданне для Сямёна.
2 Чорны сабака.
3 Гісторыя пра Вужынага Караля.
4 Падарожжа на Ласіную гару.
5 Залатая карона.
6 Паспяховае паляванне.
7 Чуткі пра Сямёна.
8 Сустрэча з Марысяй.
9 Канец шанцавання.

Такім чынам, да вывучэння апавядання "Вужыная карона" Яна Баршчэўскага ў шостым класе настаўніку неабходна ставіцца з адпаведнай адказнасцю. Нягледзячы на невялікую колькасць гадзін (дзве), адведзеных на асэнсаванне твора, важна забяспечыць не толькі засваенне матэрыялу, але і натхніць вучняў на далейшае вывучэнне творчасці Яна Баршчэўскага, зацікавіць яго асобай.

## Літаратура


1 Беларуская мова і літаратура. 6 клас : прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне : дапаможнік для настаўнікаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання / С. В. Мартынкевіч, Л. К. Цітова – Мінск : Нац. ін-т адукацыі : Аверсэв, 2023. – 94 с.

2 Хаўстовіч, М. Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст. / М. Хаўстовіч. – Мінск: БДУ, 2001. – 171 с.

3 Бельскі, А. І. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі, Л. К. Цітова. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 320 с.

4 Вужыны Кароль – уладар падземнага выраю. – URL: https://natatnik.by/vuzhyny-karol (дата звароту: 20.04.2025).


**УДК 811.161.1'42'373.612.2:821.161.1-31*Н.В.Гоголь**

***М. С. Васина***

## ЯЗЫКОВЫЕ СРЕДСТВА СОЗДАНИЯ МИСТИЧЕСКОЙ АТМОСФЕРЫ В КНИГЕ Н. В. ГОГОЛЯ «ВЕЧЕРА НА ХУТОРЕ БЛИЗ ДИКАНЬКИ»

*В данной статье исследуются языковые средства, способствующие созданию мистической атмосферы в книге Н. В. Гоголя «Вечера на хуторе близ Диканьки». Анализируется лексика, связанная с нечистой силой, которая формирует мистический контекст произведения. Особое внимание уделяется тропам, таким как эпитеты и сравнения, которые усиливают выразительность текста и создают зловещую атмосферу. В работе применяются лексико-семантический и стилистический анализ.*

Мистическое в литературе – это обращение к сфере потустороннего, сверхъестественного, загадочного и таинственного. Оно подразумевает выход за пределы рационального восприятия действительности и проникновение в сферу неведомого и запредельного.

Мистическое в литературе позволяет авторам расширять границы художественного отображения действительности. Писатели могут изображать параллельные